## ЕРАШОВА НІНА УЛАДЗІМІРАЎНА.
## 95 ГАДОЎ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ

Ніна Уладзіміраўна Ерашова (1918–1992) – ураджэнка в. Багданаўка Хоцімскага раёна. Пасля школы паступіла на геаграфічны факультэт Магілёўскага педінстытута (1938–1946, скончыла з Чырвоным дыпломам). Вучылася з ахвотай, з цікавасцю слухала лекцыі буйных (прафесары М. Самбікін, А. Мядзведзеў, дацэнты П. Загарын, М. Майсеня) і пачынаючых (М. Ратабыльскі, П. Лярскі і інш.) выкладчыкаў. Вучоба была перарвана вайной (у 1943–1945 гг. служыла ў інжынерных частках; мае ваенныя ўзнагароды).

У 1946 г. Ніна Уладзіміраўна была запрошана на працу на геафак МДПІ (спачатку асістэнтам кафедры эканамічнай геаграфіі, потым – фізічнай). У 1951–1953 гг. працавала ў Магілёўскім настаўніцкім інстытуце, па сумяшчэнню вяла курс методыкі выкладання на геаграфічным факультэце. Скончыла аспірантуру пры ЛДПІ імя А. Герцэна. Кандыдат геаграфічных навук (1965). У 1958–1975 гг. Н.У. Ерашова працавала на кафедры фізічнай геаграфіі ў якасці старшага выкладчыка, дацэнта (з 1971) – вяла курсы дынамічнай і гістарычнай геалогіі, глебазнаўства і геаграфіі глебаў, кіравала геалагічнай і далёкай комплекснай практыкамі. Правадзейны член геаграфічнага та-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

варыства Н.У. Ерашова ў 1970-х гг. выконвала абавязкі (да 1975) вучонага сакратара Магілёўскага аддзела ГТ БССР, актыўна супрацоўнічала з таварыствам «Веды», чытала лекцыі ў абласным інстытуце ўдасканалення настаўнікаў, працавала ў таварыстве аховы прыроды, абіралася дэпутатам гарадскога Савета, засядацелем гарадскога суда. Ніна Уладзіміраўна – аўтар шматлікіх артыкулаў у «Известиях ВГО», «Народной асвете», «БелСЭ», дапаможнікаў, у т.л. «Карысныя выкапні Беларусі» (Мінск, 1970), суаўтар «Пособия по географии для поступающих в вузы» (Мінск, 1978).

У 1975 г. Ніна Уладзіміраўна выйшла на пенсію і пераехала на жыхарства ў г. Бровары Кіеўскай вобласці. Памерла ў 1993 г. Пахавана ў г. Бровары

*У.Г. Хамякоў*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова